Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў
Стаўбцоўскі раённы выканаўчы камітэт

Культурны імідж Беларусі

РЭГІЯНАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА НАЛІБОЦКАГА КРАЮ І КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

XI Тышкевіцкія чытанні

аг. Налібокі, 18 верасня 2026 г.

Зборнік навуковых артыкулаў

Мінск
БДУКМ
2026

ЗМЕСТ

Карчевская Н. В. Историко-культурное наследие – национальное достояние белорусского народа …….. 5

Культурная спадчына роду Тышкевічаў

Смолік А. І. Міфалагізацыя гістарычнай асобы Канстанціна Тышкевіча …….. 9

Суша А. А. Працы «Апісанне Барысаўскага павета» Яўстаха Тышкевіча і «Вілія і яе берагі» Канстанціна Тышкевіча як крыніцы фарміравання гістарычнай памяці і рэгіянальнай ідэнтычнасці беларусаў ……... 14

Граник Е. А. Египет глазами белорусского аристократа: путевые заметки и культурное наследие Михаила Тышкевича …….. 25

Гісторыка-культурная спадчына Налібоцкага краю

Шелупенко Н. Е., Шмирейчик В. Г. Становление и развитие культурных индустрий в Налибокском регионе ……... 34

Соколова О. М. Античность как ресурс постпамяти: рецепция классического наследия в архитектуре Налибокского края ……. 39

Лашук В. А. Аналіз марфатыпаў гістарычных цэнтраў малых гарадоў у кантэксце фарміравання рэгіянальнай ідэнтычнасці (на прыкладзе Валожына і Івянца) …….. 59

Кухто Л. К. Историко-культурное наследие Налибокского края: сверженский фаянс ……... 63

Сухоцкая Т. Ф. Налібоцка-ўрэцкае шкло ў гісторыка-культурнай спадчыне беларускага народа …….. 70

Кнатько Ю. И. Мемориальные ландшафты Столбцовского края: природный аспект формирования коллективной памяти ……. 77

Бамбешка І. І. Вопыт мемарыялізацыі жыцця і дзейнасці Ф. Э. Дзяржынскага музейнымі сродкамі ……. 84

Герасименок В. Д. Сохранение исторической памяти в Республике Беларусь: мемориалы и памятники Первой мировой войны в Налибокском крае …….. 90

Турыстычны патэнцыял і сучасныя практыкі захавання спадчыны

Криштаносова Е. А. Историко-культурный потенциал Налибокского края в контексте туристической деятельности …… 97

Соколовская М. М. Историко-культурное наследие Налибокского края в контексте развития туристической деятельности …….. 102

Матусевіч А. Д. Эскапізм гарадскіх жыхароў як сацыякультурная практыка (на прыкладзе Налібоцкай пушчы) …… 105

Шэметава А. А. Адаптацыйны патэнцыял аграэкатурызму Налібоцкага краю ……. 111

3. Шапинская, Е. Н. Путешествие на Восток как феномен туристического эскапизма / Е. Н. Шапинская // Культура культуры. – 2017. – № 2 (14). – С. 72–87.

4. Шапинская, Е. Н. Эскапизм в пространстве массовой культуры / Е. Н. Шапинская // Ярославский педагогический вестник. – 2019. – № 1 (106). – С. 180–185.

А. А. Шэметава,
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
г. Мінск

АДАПТАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ АГРАЭКАТУРЫЗМУ НАЛІБОЦКАГА КРАЮ

Актуальнасць адаптацыйнага патэнцыялу аграэкатурызму Налібоцкага краю для замежных турыстаў і тых, хто атрымлівае адукацыю, у тым ліку грамадзяне з КНР, у Рэспубліцы Беларусь абумоўлена ўнікальнай магчымасцю інтэграцыі ў нацыянальную культуру, што садзейнічае фарміраванню міжкультурнага дыялогу, новых сацыяльных сувязей і зніжэнню ў іх узроўню стрэсу.

У 2025 г. колькасць замежных турыстаў, якія наведалі Беларусь, дасягнула 579,2 тыс. чалавек, а па бязвізавым рэжыме – больш як 220 тыс. грамадзян з 38 краін [2, с. 15]. Акрамя турыстаў, у рэспубліцы вучацца і працуюць тысячы кітайскіх грамадзян, што робіць праблему іх адаптацыі практычна значнай.

Канцэпцыя міграцыйнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2024–2028 гады прадугледжвае арганізацыю ўмоў для адаптацыі і інтэграцыі мігрантаў [6]. Нацыянальная стратэгія развіцця турызму да 2035 года ставіць задачу стварэння адаптыўнай інфраструктуры і даступнага асяроддзя на турыстычных аб’ектах. Турызм прызнаны чалавекаарыентаванай галіной, што сугучна задачам гуманітарнай адаптацыі замежных грамадзян [5].

Аналізуючы працы расійскіх і беларускіх даследчыкаў В. Т. Дземянчыка [1], Т. К. Сяргеевай [8] і іншых, можна сцвярджаць пра станоўчы адаптацыйны патэнцыял аграэкатурызму.

Аграэкатурызм – від турызму, які знаёміць з аграрнай дзейнасцю, экалагічнымі тэхналогіямі і прыроднымі аб'ектамі. Спалучэнне культурнай асветы і экалагічнай усвядомленасці дапамагае мігрантам лепш зразумець і прыняць каштоўнасці і лад жыцця беларусаў. Ва ўстановах вышэйшай адукацыі Беларусі экскурсія разглядаецца як форма сацыякультурнай адаптацыі. Уключэнне аграэкатурызму ў праграму сацыякультурнай адаптацыі можа павысіць якасць адукацыйнага працэсу, які садзейнічае ўмацаванню сяброўства паміж рознымі народамі і развіццю міжкультурных зносін.

Існуюць наступныя разнавіднасці аграэкатурызму: рэкрэацыйны і аздараўленчы, культурна-пазнавальны і прыродаахоўны, адукацыйны.

Рэкрэацыйны і аздараўленчы аграэкатурызм уключае прагулкі па прыродных тропах, наведванне экалагічна чыстых тэрыторый, арганізацыю SPA, фітатэрапіі, фітнес-трэніровак на свежым паветры, выкарыстанне прыродных рэсурсаў для адпачынку (возера, лес, лячэбныя травы).

Да культурна-пазнавальнага аграэкатурызму адносіцца знаёмства з беларускімі традыцыямі і святамі, нацыянальнай кухней і аліментарнай культурай з дэгустацыяй натуральных прадуктаў, наведванне этнаграфічных музеяў, фестываляў і культурных мерапрыемстваў [Там жа, с. 12].

Прыродаахоўны аграэкатурызм уяўляе сабой удзел у мерапрыемствах па ахове прыроды, аднаўленні экасістэм; навучанне прынцыпам экасістэм і ўстойлівага развіцця; назіранне за жывёламі і раслінамі.

Да адукацыйнага аграэкатурызму адносяцца экскурсіі па фермерскіх гаспадарках і вясковых мясцінах, майстар-класы па традыцыйных рамёствах, сельскагаспадарчых тэхналогіях [Там жа, с. 10].

Кітайскім грамадзянам, якія вучацца ў Беларусі, для знаёмства і ўваходжання ў новае сацыякультурнае асяроддзе краіны можна прапанаваць Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Налібоцкі», які знаходзіцца на захадзе краіны (65 км ад Мінска) і займае плошчу 86 892 га [7]. Акрамя прыроднай разнастайнасці, пушча валодае багатай гісторыяй і культурай: на прылеглых тэрыторыях размяшчаюцца археалагічныя і архітэктурныя помнікі, якія ўвайшлі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных

каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Толькі за апошняе дзесяцігоддзе адноўлены гістарычныя сядзібы ў Дзяржынаве і Суле, створаны рыбалоўныя базы на возеры Кромань і Сябрыньскіх азёрах; павялічылася колькасць аграсядзіб і экамузеяў; штогод праводзяцца розныя фестывалі і веламарафон «Налібокі»; працуюць некалькі эколага-турыстычных маршрутаў і экалагічных сцежак.

Першая экалагічная сцежка, адкрытая ў заказніку, названа «Сябрыньскае перакрыжаванне» і прадстаўлена кальцавой сцежкай (960 м) з драўляным насцілам. Маршрут уяўляе сабой лясную трасу, якая праходзіць па трох біятопах: лясны, лугавы, балотны. Тут прадугледжаны паркінг, інфармацыйныя стэнды, альтанкі, аглядавыя пляцоўкі [Там жа].

Турыстычны веламаршрут «Дарогамі Налібоцкай пушчы» (38 км) пачынаецца з пітомніка па развядзенні птушак цецерападобных парод у раёне вёскі Сябрына і перасякаецца з трапой «Сябрыньскае перакрыжаванне», а затым ідзе ў бок цэнтральных магістральных меліяратыўных каналаў [Там жа].

Праз тэрыторыю Налібоцкай пушчы пралягаюць эколага-турыстычныя маршруты: «Валожынскі гасцінец, веламаршруты «Bike 4 SDGs» і «Маршрут сталіц» (72 км па тэрыторыі пушчы). Зялёны маршрут «Валожынскі гасцінец» (працягласцю каля 150 км) праходзіць па краю Налібоцкай пушчы праз экамузеі, аграсядзібы, прыродныя і гістарычныя славутасці, па якому магчыма вандраваць як пешшу, так і на веласіпедах. Веламаршрут «Bike 4 SDGs» (22 км) пачынаецца ў аг. Пяршаі і заканчваецца ў в. Белакорац на беразе р. Ісламч [Там жа].

Для байдарачнікаў і замежных турыстаў, у тым ліку з КНР, у заказніку «Налібоцкі» на беразе р. Ісламч адкрыты стаянкі: «Сутокі», «Вялае» ніжняя стаянка, «Вялае» верхняя стаянка, «Белакорац», «Марчаха» [Там жа]. Прыпынкі «Вялае» ў пушчы знаходзяцца побач з былой рэзідэнцыяй для палявання роду графаў Тышкевічаў – старажытнага шляхецкага роду Вялікага Княства Літоўскага, тут была і фоталабараторыя графа Бенедыкта, калекцыянера і мецэната, што дае магчымасць пазнаёміцца з архітэктурнай спадчынай і гісторыяй Беларусі. Лясны масіў захаваўся ў добрым стане дзякуючы беражлівым адносінам да прыроды прадстаўнікоў роду Тышкевічаў. У той час на тэрыторыі пушчы граф пабудаваў звярынец плошчай каля

400 га з высакароднымі аленямі, ласямі, ланямі і мядзведзямі і інш.

Сёння адміністрацыяй Налібоцкай пушчы створаны сафары-туры, якія дапамогуць бліжэй пазнаёміцца з беларускай прыродай, даведацца больш пра дзікіх жывёл і цяжкадаступныя мясціны. Для гэтага распрацаваны маршруты «Экасцежка “Сяброньскае перакрыжаванне – Плейстацэнавы парк”» (14,1 км), «Пітомнік цецерападобных птушак – Карставае возера і назад» (18,5 км) [4; 7].

На маршруце «Экасцежка “Сябрыньскае перакрыжаванне – Плейстацэнавы парк”» магчыма ўбачыць тарпанападобных коней; зубраў, аленяў, ласёў і казуль; птушак розных парод (качка-крыжанка, качка-цыранка, качка-чырка, качка-шыраканоска, качка-свіязь, качка-шылахвостка, гусь белалобая, гусь гуменніца, гусь шэрая, чыбіс, бакас, дупель, шэры журавель і інш.); сляды ваўкоў, рысяў і мядзведзяў і іншых жывёл і птушак [Там жа].

Можна выдзеліць і пешаходны маршрут «Возера Кромань» працягласцю 31 км у напрамку в. Кляцішча – в. Налібокі. Хутар на лужку каля возера Кромань – адзінае паселішча на маршруце [7].

Налібоцкі край прыцягвае да падарожжаў. На тэрыторыі пушчы ёсць усе неабходныя ўмовы для развіцця экалагічнага турызму: складаныя шматдзённыя маршруты і аглядавыя праграмы.

Аграэкатурызм у Налібоцкім краі як інструмент сацыякультурнай адаптацыі кітайскіх і іншых замежных грамадзян садзейнічае не толькі знаёмству з мясцовасцю і сельскагаспадарчымі традыцыямі, але і развіццю міжкультурнага дыялогу, умацаванню міжнацыянальных сувязей і фарміраванню пазітыўнага ўспрымання беларускай культуры і прыроды. У рамках аграэкатурызму кітайскія студэнты могуць удзельнічаць у традыцыйных сельскагаспадарчых работах, майстар-класах па народных рамёствах [3].

Такім чынам, адаптацыйны патэнцыял аграэкатурызму Налібоцкага краю ў Рэспубліцы Беларусь:

– уяўляе сабой эфектыўную платформу для інтэграцыі кітайскіх студэнтаў і замежных турыстаў у культуру Беларусі, дапа-

магае лепш зразумець гісторыю, традыцыі, прыроду, сельскую культуру краю;

– стварае ўмовы для камфортнай сацыялізацыі, зніжэння культурных бар'ераў;

– адкрывае магчымасці для міжкультурных зносін.

Паспяховая адаптацыя зніжае рызыкі сацыяльнай ізаляцыі, адзіноты і дэпрэсіі, садзейнічае міжкультурнаму дыялогу і ўмацоўвае імідж Беларусі як адкрытай і гасціннай краіны.

1. Агроэкотуризм в Припятском Полесье / В. Т. Демянчик [и др.]. – Брест : Альтернатива, 2014. – 138 с.

2. Беларусь в цифрах : стат. справ. / Нац. стат. комитет Респ. Беларусь ; редкол.: И. В. Медведева [и др.]. – Мн. : Нац. стат. комитет Респ. Беларусь, 2025. – 72 с.

3. *Беляева, Л. А.* Стратегии выживания, адаптации, преуспевания / Л. А. Беляева // Социологические исследования. – 2010. – № 2. – С. 45–49.

4. *Лукшыц, В.* Налібоцкае сафары / В. Лукшыц // Птушкі і мы. – 2009. – № 2. – С. 16.

5. Национальная стратегия развития туризма в Республике Беларусь до 2035 года : протокол заседания Межведомственного экспертно-координационного совета по туризму при Совете Министров Респ. Беларусь от 7 окт. 2020 г. № 05/34пр. – URL: https://belarustourism.by/news/НАЦИОНАЛЬНАЯ%20СТРАТЕГИЯ.pdf (дата обращения: 10.06.2026)

6. Об утверждении Концепции миграционной политики Республики Беларусь на 2024–2028 годы : постановление Совета Министров Респ. Беларусь от 23 янв. 2024 г. № 48 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22400048 (дата обращения: 10.06.2026)

7. Республиканский ландшафтный заказник «Налибокский». – URL: https://заказник-налибоки.бел/ru/ (дата обращения: 10.06.2026).

8. *Сергеева, Т. К.* Экологический туризм : учебник / Т. К. Сергеева. – М. : Финансы и статистика, 2010. – 360 с.